**УДК 314.151.5(476.5)(=162.1)(091)”1944/1946”**

**РЭПАТРЫЯЦЫЯ ПАЛЯКАЎ З ПОЛАЦКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ПОЛЬШЧУ Ў 1944–1946 гг.: САЦЫЯЛЬНАЯ ПРЫНАЛЕЖНАСЦЬ І МАЁМАСНАЕ СТАНОВІШЧА**

***канд. гіст. навук, дац. Л.А. КОЗІК***
**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск**

*Апісваюцца ўмовы і вылучаюцца этапы перасялення палякаў з тэрыторыі БССР у Польшчу, адзначаецца, што не ўсе жадаючыя змаглі выехаць. Абапіраючыся на статыстычныя дадзеныя, аўтар паказаў, што большасць тых, хто выехаў былі сялянамі (62%), у той час як прадстаўнікі іншых сацыяльных груп (рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя і інш.) не перавышалі 6% ад агульнай колькасці. Прыводзяцца дадзеныя аб колькасці вывезенай палякамі жывёлы і пакінутай у Беларусі маёмасці, што дазволіла аўтару ацаніць маёмаснае становішча рэпатрыянтаў і прыйсці да высновы, што ў Польшчу выязджалі пераважна забяспечаныя людзі.*

Заканчэнне Другой сусветнай вайны азнаменавалася не толькі перамогай над фашысцкай Германіяй, але і тэрытарыяльнымі зменамі, якія прывялі да перасялення вялікай групы насельніцтва. Апошняе было звязана з жаданнем урадаў еўрапейскіх краін, з аднога боку, пазбавіцца ад “непажаданых элементаў”, якія патэнцыйна могуць несці пагрозу адзінству і цэласнасці дзяржавы, а з другога – імкненнем стварыць мананацыянальнае грамадства як фактар унутранай стабільнасці.

Працэс перасялення закрануў і БССР, якая 9 верасня 1944 г. падпісала з Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення Пагадненне аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР [1, с. 213–219]. Яно прадугледжвала дабраахвотны выезд палякаў і яўрэяў, якія пражывалі ў заходніх абласцях БССР і мелі да 17 верасня 1939 г. польскае грамадзянства, на тэрыторыю Польшчы і адпаведна беларусаў з Польшчы ў БССР.

Для арганізацыі перасялення на тэрыторыі Беларусі было створана дзесяць прадстаўніцтваў Савета народных камісараў, адно з якіх – Глыбоцкае – кантралявала працэс рэгістрацыі і эвакуацыі палякаў з Полацкай вобласці. Умовы пагаднення закраналі 9 з 15 яе раёнаў: Глыбоцкі, Дунілавічскі, Відзаўскі, Браслаўскі, Міёрскі, Дзісненскі, Плісkі, Докшыцкі і Шаркаўшчынскі.

Двухбаковыя дамоўленасці прадугледжвалі публічнае паведамленне насельніцтва аб падпісаным пагадненні і яго ўмовах праз сродкі масавай інфармацыі і органы мясцовай улады. Жадаючыя выехаць мелі права вывозіць адзенне, абутак, бялізну, прадукты харчавання, сельскагаспадарчы інвентар і іншыя прадметы хатняга і гаспадарчага побыту агульнай вагой да 2 тон на адну сям’ю, а таксама жывёлу і птушак, якія належылі гаспадарцы. Разам з гэтым забаранялася вывозіць папяровыя, залатыя ці срэбраныя грошы за выключэннем польскіх папяровых у памеры да 1000 злотых ці савецкіх да 1000 рублёў на аднаго чалавека, каштоўныя металы, прадметы даўніны і мастацкія творы, машыны, матацыклы і інш. Перасяленцы вызваляліся ад выплаты недаімкаў па натуральных пастаўках, грашовых падаткаў, страхавых плацяжоў. Каб нейкім чынам кампенсаваць матэрыяльныя страты ад пакінутага выязджаючым абяцалі дапамогу на новым месцы жыхарства [1, с. 213–214].

Жадаючыя выехаць павінны былі падаць пісьмовую ці зрабіць вусную заяву, якая фіксавалася польскімі ўпаўнаважанымі ў прысутнасці прадстаўнікоў Савета міністраў БССР альбо мясцовых органаў улады. Першапачаткова прадугледжвалася, што запіс палякаў будзе адбывацца з 15 верасня па 15 кастрычніка 1944 г., аднак пад уплывам розных фактараў польскае і савецкае (беларускае) кіраўніцтва было вымушана працягнуць гэты тэрмін і не аднойчы. Усяго ў працэсе рэгістрацыі палякаў з тэрыторыі БССР у цэлым і Полацкай вобласці ў прыватнасці можна вылучыць чатыры этапы: 1) да студзеня 1945 г., 2) люты – май 1945 г., 3) чэрвень – лістапад 1945 г., 4) снежань 1945 – 15 студзеня 1946 г. [2, арк. 21–24]. У адпаведнасці з пазначанымі датамі адбывалася і высяленне, якое, праўда, завяршылася толькі ў чэрвені 1946 г.

На першым этапе магчымасцю выехаць у Польшчу скарысталася невялікая група палякаў. Сітуацыя змянілася ў лютым 1945 г., калі стала зразумела, што ўсталяваная беларуска-польская мяжа істотным чынам не зменіцца, а таму трэба выбіраць краіну, з якой будзе звязаны далейшы лёс. Як вынік да 5 мая 1945 г. у Глыбоцкім райпрадстаўніцтве зарэгістравалася 16 546 сем’яў агульнай колькасцю 60 064 чалавек [3, арк. 281]. Такая актыўнасць мясцовага насельніцтва выклікала занепакоенасць абласнога і рэспубліканскага кіраўніцтва, якое сутыкнулася з праблемай выканання дзяржаўных паставак (у адпаведнасці з двухбаковым пагадненнем, выязджаючыя вызваляліся ад іх). У гэтай сувязі з 8 мая 1945 г. у Полацкай вобласці пачалі працу змешаныя камісіі па выяўленню нацыянальнай прыналежнасці жадаючых выехаць у Польшчу (усяго дзейнічала 9 такіх камісій). Не спыняючыся на аналізе іх дзейнасці падрабязна, прывядзем толькі адзін прыклад. За перыяд з 8 па 17 мая 1945 г. у Глыбоцкае райпрадстаўніцтва паступіла 11284 заявы на выезд, з якіх толькі 284 заяўцеля былі прызнаныя камісіяй палякамі [3, арк. 282аб].

Калі гаварыць аб агульнай колькасці зарэгістраваных на выезд з Полацкай вобласці, то па стану на 15 чэрвеня 1946 г. (дата афіцыйнага заканчэння перасялення – *Л. К.*) яна склала 19 656 гаспадарак (сем’яў) агульнай колькасцю 73 077 чалавек. Пасля “праверкі” спісаў з іх было выкрэслена 9 705 сем’яў

(36 009 чалавек) як беларускія, яшчэ 3 594 гаспадаркі (14 271 чалавек) як тыя, хто адмовіўся ад эвакуацыі, і 238 сем'яў (918 чалавек), якія не з'явіліся на пагрузку. Вынікам згаданага стала тое, што з Полацкай вобласці выехала толькі 6 357 сем'яў ці 22 797 чалавек [2, арк. 31; 4, арк. 120–123].

Выязжалі палякі пераважна чыгуначным транспартам, але яго катастрафічна не хапала ва ўмовах заканчэння ваенных дзеянняў і перавозкі частак Чырвонай арміі з Заходняй Еўропы на ўсход. У гэтай сувязі з вясны 1945 г. некаторыя пачалі пакідаць БССР самастойна, аднак такіх у Полацкай вобласці было няшмат.

Аналіз агульных статыстычных дадзеных, якія перадала Глыбоцкае райпрадстаўніцтва ў Баранавічы галоўнаму ўпаўнаважанаму СНК БССР, і паіменных спісаў зарэгістраваных на выезд паказвае, што пераважную большасць выехаўшых складалі сяляне (62%). Сярод прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп і прафесій былі рабочыя (5,8%), служачыя (3,6%), саматужнікі (2,1%), чыгуначнікі (2,1%), настаўнікі (0,7%), святары (0,3%), доктары (0,2%), інжынерна-тэхнічныя работнікі (0,07%). Значная частка выязжаючых трапіла ў катэгорыю “іншыя” (23%), куды запісвалі хатніх гаспадынь, служанак, цырульнікаў, шаўцоў і г. д. [2, арк. 31; 4, арк. 121; 5].

Калі аналізаваць дадзеныя аб сацыяльным і прафесійным складзе палякаў па асобных раёнах, то яны будуць адрозніваццa, што, на наш погляд, звязана з асаблівасцямі ранейшага развіцця рэгіёна. Вынікі праведзеных падлікаў па раёнах прадстаўлены ў табліцы 1.

Табліца 1

**Сацыяльныя групы насельніцтва, якое выехала з Полацкай вобласці ў Польшчу ў 1944–1946 гг. (у %)**

| Назва раёна | Сяляне | Рабочыя | Служачыя | Саматужнікі | Настаўнікі | Доктары | Інж.-тэхн. работнікі | Святары | Чыгуначнікі | Іншыя |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Глыбоцкі | 57 | 8,3 | 7,2 | 2 | 0,8 | 0,2 | 0,26 | 0,4 | 2 | 21,6 |
| Дунілавічскі | 60 | 5,5 | 3,1 | 0,97 | 0,92 | 0 | 0 | 0,3 | 0,6 | 28,8 |
| Відзаўскі | 69 | 2,3 | 1,9 | 1,1 | 0,4 | 0,5 | 0 | 0,1 | 0,06 | 24,5 |
| Браслаўскі | 54 | 7,5 | 3,5 | 7,1 | 1,3 | 0,2 | 0,1 | 0,16 | 0,4 | 25,7 |
| Міёрскі | 65 | 5 | 2,5 | 2,3 | 0,05 | 0,26 | 0,1 | 0,8 | 0,16 | 23,5 |
| Дзісненскі | 74 | 3,3 | 2,2 | 0,96 | 0,38 | 0,01 | 0,01 | 0,7 | 0,3 | 17,6 |
| Плiскі | 70,6 | 2,9 | 1,95 | 0,96 | 0,6 | 0,1 | 0,04 | 0,19 | 5,2 | 17,4 |
| Докшыцкі | 38,5 | 16,1 | 7,3 | 1,7 | 1,1 | 0,3 | 0 | 0,08 | 9,5 | 25,4 |
| Шаркаўшчынскі | 61,3 | 4,1 | 5,9 | 1,6 | 0,5 | 0,5 | 0,1 | 0,3 | 0,1 | 25,5 |

Крыніца: [падлічана на падставе: 2, арк. 31; 4, арк. 121].

Аб маёмасным становішчы людзей, якія выязжалі, сведчаць дадзеныя аб колькасці сельскагаспадарчай жывёлы, якую вывезлі, апісанне пакінутай маёмасці, яе колькасці, кошту і якасці. Інфармацыя па асобных раёнах некалькі адрозніваецца, таму пры яе параўнанні неабходна ўлічваць той факт, што выязжалі як жыхары горада, так і вёскі. У гэтай сувязі статыстычныя дадзеныя хутчэй адлюстроўваюць агульную сітуацыю па вобласці.

Табліца 2

**Колькасць хатняй жывёлы, вывезенай палякамі Полацкай вобласці ў Польшчу ў 1944–1946 гг.**

| Назва раёна | Колькасць сем'яў (гаспадарак) | Коні | Каровы | Свінні | Авечкі і козы |
|---|---|---|---|---|---|
| Глыбоцкі | 752 | 213 | 444 | 430 | 398 |
| Дунілавічскі | 764 | 362 | 720 | 436 | 582 |
| Відзаўскі | 682 | 555 | 892 | 582 | 963 |
| Браслаўскі | 817 | 267 | 508 | 212 | 229 |
| Міёрскі | 875 | 408 | 717 | 426 | 341 |
| Дзісненскі | 460 | 299 | 495 | 341 | 550 |
| Плiскі | 1095 | 714 | 1240 | 995 | 1089 |
| Докшыцкі | 513 | 123 | 352 | 278 | 149 |
| Шаркаўшчынскі | 399 | 245 | 353 | 206 | 243 |
| Усяго | 6357 | 3186 | 5721 | 3875 | 4544 |

Крыніца: [2, арк 32].

Кошт пакінутай у Полацкай вобласці маёмасці Глыбоцкае райпрадстаўніцтва ацаніла ў 5 323 330 савецкіх рублёў. Гаворка ідзе пра 9 169 дамоў, 2 235 гаспадарчых забудоў (гумно, сараі, амбары, склады), 252 лазні, 23 кузні і інш. Цікава, што сельскагаспадарчага інвентара засталося толькі 24 адзінкі [4, арк. 117]. Мы бачым некалькі прычын такой малой лічбы: 1) людзям дазвалялі забіраць з сабою плугі, сеялкі, уборачныя машыны, якія для земляробаў уяўлялі каштоўнасць у любым месцы жыхарства (усяго з

Полацкай вобласці было вывезена 1 383 плугі, 11 сеялак і 20 уборачных машын) [4, арк.121], 2) продаж суседзям ці перадача сваякам, 3) адсутнасць у вялікай колькасці.

Калі ж прааналізаваць па раёнах паіменныя вопісы пакінутай маёмасці [10–18], то за сухімі лічбамі аб яе колькасці высветліцца наступнае. У Браслаўскім раёне большасць жылых пабудоў была драўлянай, з каменным падмуркам, ашалёваная, а дах крыты гонтам. Памеры хат ваглаіся ад 6 × 2,8 м да 12 × 9 м і нават больш (можна меркаваць, што ў некаторых выпадках улічваліся гаспадарчыя прыбудовы, якія былі пад адным дахам, бо цяжка ўявіць сабе пасляваенны дом памерам 18 × 7,6 м – *Л. К.*), а надзелы зямлі былі ад 0,1 да 10 і больш гектараў [падрабязней: 10]. У сваю чаргу ў Відзаўскім, Глыбоцкім, Плісскім раёнах пераважалі хаты, крытыя саломай, дранкай, зрэдку гонтам, біналітам ці чарапіцай (апошняе было характэрна для пабудоў у мястэчках ці гарадах). Іх памер быў меншы, чым на Браслаўшчыне, а вось зямельныя надзелы тых, хто жыў на хутарах, дасягалі 20 га, а ў Дунілавічскім раёне і звыш 35 га. Пры гэтым на Дунілавіччыне было шмат глінабітных дамоў і гаспадарчых забудоў [11–12; 15; 17].

Такім чынам, аналіз статыстычных дадзеных, сабраных Глыбоцкім райпрадстаўнітвам, дазваляе сцвярджаць, што пераважную большасць выехаўшых у 1944–1946 гг. з Полацкай вобласці палякаў складалі сяляне (62%), прычым як малазямельныя, так і "сярэднякі". Прадстаўнікі іншых сацыяльных слаёў не перавышалі 6% ад агульнай лічбы перасяленцаў. Колькасць вывезенай хатняй жывёлы і сельскагаспадарчых прыладаў працы разам з ацэнкай пакінутай маёмасці сведчыць пра тое, што выязджалі ў Польшчу ў пераважнай большасці добра забяспечаныя, заможныя людзі. Аналіз кожнага з 69 транспартаў, якім адпраўлялі палякаў з Полацкай вобласці, паказвае, што гэта група насельніцтва ехала ў апошнюю чаргу – ў снежні 1945 – першай палове 1946 г. І у гэтай сувязі ўзнікае іншае пытанне – а якой была асноўная прычына выезду ў Польшчу? Самасвядомасць паляка і жаданне жыць у сваёй краіне ці досвед савецкай рэчаіснасці ў 1939–1941 гг. і жаданне збегчы ад яе ў спадзяванні на лепшае жыццё на новым месцы? Упэўнена можна сказаць, што ў кожнага, хто выехаў, было на гэты конт уласнае меркаванне.

ЛІТАРАТУРА


1. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 12 т. / Академия наук СССР, Ин-т славяноведения, Польская академия наук, Сектор истории польско-советских отношений. – М. : Наука, 1963–1986. – Т. 8 : январь 1944 г. – декабрь 1945 г. / подгот. Э. Басиньский [и др.]. – 1974. – 680 с.
2. Докладные записки об итогах эвакуации населения // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 788. Воп. 1. Спр. 23..
3. Донесения районных представителей об эвакуации населения // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 1. Спр. 11.
4. Списки граждан Полоцкой области выехавших в Польшу и материалы по завершении эвакуации (докладные записки, рапорта, протоколы, акты, сведения) // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 60.
5. Глубокское райпредставительство СМ БССР по эвакуации. Алфавитная книга граждан выехавших в Польшу // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 55.
6. Глубокское райпредставительство СМ БССР по эвакуации. Алфавитная книга граждан выехавших в Польшу // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 56.
7. Глубокское райпредставительство СМ БССР по эвакуации. Алфавитная книга граждан выехавших в Польшу // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 57.
8. Глубокское райпредставительство СМ БССР по эвакуации. Алфавитная книга граждан выехавших в Польшу // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 58.
9. Глубокское райпредставительство СМ БССР по эвакуации. Алфавитная книга граждан выехавших в Польшу // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 59.
10. Описи оставленного имущества граждан Браславского района Полоцкой области, выехавших в Польшу // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 61.
11. Описи оставленного имущества граждан Видзевского района, выехавших в Польшу // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 62.
12. Описи оставленого имущества граждан Глубокского района Полоцкой области // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 63.
13. Описи оставленного имущества граждан Дисненского района Полоцкой области // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 64.
14. Описи оставленного имущества граждан Докшицкого района Полоцкой области // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 65.
15. Описи оставленного имущества граждан Дуниловичского района Полоцкой области // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 66.
16. Описи оставленного имущества граждан Миораского района Полоцкой области // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 67.
17. Описи оставленного имущества граждан Плисского района Полоцкой области // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 68.
18. Описи оставленного имущества граждан гор. Барановичи и Барановичской, Брестской, Гродненской и Полоцкой областей выехавших в Польшу // НАРБ. – Ф. 788. Воп. 2. Спр. 7.


## THE REPATRIATION OF THE POLES FROM THE POLATSK REGION TO POLAND IN 1944 – 1946: SOCIAL BELONGINGS AND PROPERTY STATUS

*L. KOZIK*

*The conditions and the stages of the repatriation of the Poles from the territory of BSSR to Poland are described in the article. It is noted that not all who wanted to leave could make it. By using statistical data, the author shows that the majority of those who left were peasants (62%) while representatives of the other social groups (workers, employees, the intellectuals, etc.) didn't exceed 6% of the total number. Statistical data on quantity of property which was taken out by the Poles and the property they left in Belarus are provided in the article. It has allowed the author to estimate the property status of the repatriates. She came to the conclusion that mainly wealthy people left for Poland.*

Polotsk SU